**К. Станкевіч**

# ШТОДЗЁННАЕ ЖЫЦЦЁ НАСЕЛЬНІЦТВА ГОМЕЛЯ Ў ПЕРЫЯД З 1991 ПА 1994 гг.

Сучасныя школьныя падручнікі па гісторыі Беларусі не забяспечваюць вучняў патрэбнай інфармацыяй аб постсацыялістычным транзіце – перыядзе пасля распаду СССР і да ўмацавання інстытута прэзідэнцтва і стварэння Канстытуцыі ў РБ. Праз гэта многія людзі маюць даволі аднабаковае ўяўленне аб тым часе, ці не маюць яго ўвогуле. Аднак без асэнсавання той сітуацыі немагчыма зразумець падзеі, што адбываюцца ў краіне зараз. Таму асноўнай мэтай даследвання можна лічыць аналіз асаблівасцей штодзённага жыцця гамяльчан падчас пераходнага перыяду з 1991 па 1994 гг. з розных бакоў.

Галоўная праблема – супярэчлівыя адчуванні простых людзей, насельніцтва краіны, цяжкасці, з якімі яны сутыкнуліся. Дэталёвы разгляд падзей ажыццяўляўся на аснове падыхода «oral history» і матэрыялаў СМІ. Даследванне было звужана да межаў г. Гомеля. У якасці крыніц былі выкарыстаны:

- школьныя падручнікі па гісторыі Беларусі;
- поўнае акадэмічнае выданне гісторыі Беларусі ў 6 тамах (Касцюк М. (рэд.));
- нумары газет «Гомельская праўда» і «Гомельскія ведамасці» за 1991–1994 гг.;
- артыкулы з інтэрнэт-выданняў.

Таксама было апытана 5 сведкаў, якія жылі ў той час.

У выніку праведзенага даследавання сфармуляваны наступныя высновы:

1. Цяжкасці назіраліся не толькі ў эканамічнай, але і ў сацыяльнай, культурнай і палітычнай сферах жыцця.

2. Менавіта ў гэты час людзі страцілі веру ў камунізм, пра што сведчаць шматлікія артыкулы ў газетах на аснове лістоў ад чытачоў. Але людзям патрэбна была падтрымка ў часы крызісу. Гэтую нішу заняла рэлігія. Яшчэ да распаду СССР, у канцы 1980-х гг., у Беларусі ажывілася рэлігійная дзейнасць. Уздым яе адбыўся ў 1992 г., калі пачалася масавая рэгістрацыя каталіцкіх, пратэстанцкіх і іншых прыходаў. У пачатку 1990-х гг. на месцы

былога праваслаўнага храма ў Гомелі быў узведзены касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі, які да сённяшняга дня з'яўляецца адзіным каталіцкім храмам на тэрыторыі горада. Таксама з'яўляліся шматлікія рэлігійныя секты, чараўнікі, лекары і прапаведнікі – атрыбуты смутнага часу. Іх дзейнасць развярнулася не толькі ў нашай краіне, але і на ўсёй постсавецкай прасторы.

3. Нягледзячы на цяжкасці 1991–1994 гг. далі надзею на развіццё ў Беларусі рыначнай эканомікі, пашырэнні міжнародных кантактаў.

4. У гэты час пачалося нацыянальнае адраджэнне, у тым жа Гомелі было 50 школ з беларускай мовай навучання. Тут жа адкрыўся першы беларускі прыватны незлежны тэатр. Татальнай беларусізацыі не адбылося, бо большасць людзей хацела проста сытна есці.

Як мы бачым зараз, ніхто не патлумачыў беларусам ні мэтаў рэформаў, ні таго, навошта і ў імя чаго трэба прайсці праз пэўныя цяжкасці і пазбаўленні. Грамадства аказалася не гатова да галоўнага – да самастойнасці. Такім чынам, дадзены перыяд нельга характарызаваць як выключна адмоўны ці станоўчы, што зараз назіраецца ў некаторых падручніках і СМІ. Варта засяроджваць больш увагі на гэтым перыядзе ў працэсе адукацыі, выдзяляць асобны час для дадзенай тэмы ў межах школьнага курсу гісторыі Беларусі ў старэйшых класах.